УДК 069.01+069.4+069.8]:719

*Д. В. Герасімёнак*

# Сутнасць музеефікацыі: генезіс і эвалюцыя

*Музеефікацыя як працэс захавання гісторыка-культурнай спадчыны, выяўлення навуковай і мастацкай каштоўнасці аб’ектаў мінулай эпохі, прайшла доўгі шлях развіцця ад імкнення грамадства захоўваць помнікі гісторыі і культуры да шырокамаштабнага і мэтанакіраванага пошуку, вывучэння, актуалізацыі і папулярызацыі гістарычных, культурных і прыродных аб’ектаў.*

*Аўтарам акрэслены асноўныя этапы зараджэння і эвалюцыі працэсу музеефікацыі, трансфармацыі навуковых поглядаў у кантэксце сусветнага гістарычнага развіцця.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Захаванне і далейшае выкарыстанне гісторыка-культурнай спадчыны знаходзіць шырокі водгук сярод міжнароднай супольнасці. Асабліва востра паўстае пытанне аб вызначэнні таго сацыякультурнага інстытута, які зможа найбольш поўна і карэктна данесці інфармацыю аб гісторыі і культурным жыцці продкаў нашым нашчадкам.

Музеефікацыя як працэс захавання культурных каштоўнасцей пераўтварае матэрыяльную і нематэрыяльную спадчыну ў аб’ект шырокага інтарэсу грамадства, тым самым перадае існуючую сацыякультурную памяць будучым пакаленням. Як і музей, музеефікацыя зведала шэраг трансфармацый, каб прыйсці да свайго сучаснага разумення. У навуковай літаратуры паняцце «музеефікацыя» вызначаецца як кірунак музейнай дзейнасці, які заключаецца ў пераўтварэнні гісторыка-культурных і прыродных помнікаў у аб’екты музейнага паказу з мэтай максімальнага захавання і выяўлення іх гісторыка-культурнай, навуковай, мастацкай каштоўнасці [6]. Менавіта акцэнт на неабходнасць паказу музейнымі сродкамі аб’ектаў рухомай і нерухомай спадчыны спрыяе іх найбольш поўнай актуалізацыі і папулярызацыі ў сучасным грамадстве.

Тэрмін «музеефікацыя» распрацоўваўся пераважна савецкай школай музеялогіі. Упершыню ён быў уведзены ў навуковы ўжытак у 1920-я гг. савецкім даследчыкам, акадэмікам Ф. І. Шмітам, але ў прафесійнай мове музейных спецыялістаў атрымаў шырокае выкарыстанне пасля Другой сусветнай вайны. Гэта звязана з правядзеннем работ па аднаўленні і рэстаўрацыі разбураных падчас ваенных дзеянняў помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны. Аднак на той час праблемы музеефікацыі ставіліся і абмяркоўваліся ў асноўным спецыялістамі па захаванні і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры і адносіліся да аховы гісторыка-культурнай спадчыны, а музеефікацыя як самастойны напрамак музейнай дзейнасці ў музеязнаўстве не разглядалася [2, с. 390].

На працягу 1950–1960-х гг. адбываецца працэс удасканалення сутнасці гэтага паняцця, прыстасавання яго патрабаванняў (умоў) да тагачаснай сацыякультурнай сітуацыі. Спецыялісты музейнай справы вылучалі дзве формы музеефікацыі:

– «як музей», што азначала ператварэнне помніка ў самастойны аб'ект музейнага паказу з мэтай раскрыцця яго інфармацыйнага патэнцыялу, выяўлення гісторыка-культурнай каштоўнасці і ўключэння ў актуальную культуру;

– «пад музей» – механічнае прыставанне помніка гісторыі і культуры пад музейнае выкарыстанне.

У другой палавіне 1970–1980-х гг. савецкае музеязнаўства пачало вызначаць музеефікацыю як напрамак культурнай палітыкі і адначасова як галіну музейнай справы. Змест музеефікацыі вызначаўся як працэс ператварэння нерухомых помнікаў гісторыі і культуры ці прыродных аб'ектаў у аб'екты музейнага паказу, а мэта – іх захаванне і рацыянальнае выкарыстанне ў сістэме «культурнай прапаганды» [4, с. 38].

Музейная практыка канца мінулага стагоддзя прынесла новыя падыходы да захавання і прэзентацыі гісторыка-культурнай спадчыны: у сферу музейных інтарэсаў актыўна ўключыліся цэлыя ансамблі помнікаў гісторыі і культуры, навакольнае асяроддзе, гісторыка-культурныя ландшафты, аб'екты нематэрыяльнай спадчыны [6]. Гэты працэс знайшоў сваё адлюстраванне і асэнсаванне ў многіх навуковых працах, прысвечаных пытанням музейнай дзейнасці. Да іх варта аднесці абагульняючыя тэарэтычныя працы па музеязнаўстве Э. А. Шулепавай, Т. Ю. Юрэневай, фундаментальнае выданне «Российская музейная энциклопедия» і інш. Як паўнапраўны кірунак музейнай дзейнасці музеефікацыя ўпершыню была прадстаўлена М. Е. Каўлен у шэрагу навуковых публікацый і выданняў. У манаграфіі, прысвечанай музеефікацыі гісторыка-культурнай спадчыны Расіі, даследчык адзначыла, што колькасць новых музеяў, створаных на аснове музеефікацыі, расце значна хутчэй колькасці традыцыйных калекцыйных музеяў [3, с. 9–10].

Нельга пакінуць па-за ўвагай і замежны вопыт асэнсавання такога шматграннага паняцця як «музеефікацыя». M. Di Giovine сцвярджае, што канцэпцыя музеефікацыі прама звязана з экамузеямі, паколькі мае на мэце захаванне спадчыны ў жывым выглядзе. На яго думку, музеефікацыя – ідэалізаваная рэпрэзентацыя каштоўнасцей пэўнай мясцовасці ў якасці патэнцыяльнага музейнага артэфакта [8, с. 261].

Такім чынам, музеефікацыя становіцца паўнапраўным кірункам музейнай дзейнасці, прызнаецца міжнароднай супольнасцю як асноўная форма захавання матэрыяльнай і нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны, якая садзейнічае самаідэнтыфікацыі мясцовага насельніцтва, спрыяе аб'яднанню людзей у грамадстве. Тэрмін шырока

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстоўваецца ў навуковай літаратуры як перспектыўны кірунак музейнай дзейнасці ў галіне аховы гісторыка-культурнай спадчыны.

Відавочна, што спробы музеефікацыі ўнікальных рухомых артэфактаў культуры вядомы са старажытных часоў. Галоўная ўмова зараджэння традыцыі захавання культурных каштоўнасцей – зацікаўленасць ў гэтым тагачаснага грамадства. З'яўленне калекцыяніравання выклікала неабходнасць выкарыстання грамадскіх будынкаў для захавання аб'ектаў культуры. Безумоўна, дадзены працэс нельга разглядаць як музеефікацыю ў сучасным навуковым разуменні. Аднак наяўнасць прыкмет музеефікацыі паўсядзённай і мастацкай культуры ў антычным грамадстве відавочная.

Ні адна сацыякультурная з'ява не ўзнікае спантанна, яна зараджаецца ў адпаведных умовах, якія стымулююць далейшую эвалюцыю, выпрацоўку яе новых форм і г. д. Калі мы прызнаем існаванне протамузейных збораў, то мы павінны прызнаць і існаванне асобных падыходаў да іх прэзентацыі. Пры разглядзе гэтага аспекту мы лічым мэтазгодным выкарыстоўваць паняцце «протамузеефікацыя», якое, на нашу думку, азначае асобныя актуальныя на свой час падыходы да фарміравання прадмузейных збораў, у выніку чаго ствараліся спецыфічныя протамузейныя калекцыі, а таксама новыя магчымасці іх прэзентацыі.

У традыцыйных грамадствах старажытнага, антычнага і сярэдневяковага свету прынцыпы адбору, захавання і прэзентацыі прадметаў, якія адбіраліся з ўтылітарнага ўжытку па розных матывах (сакральныя, эканамічныя, сацыяльна-прэстыжныя, групавой самаідэнтыфікацыі, даследчыцкія, эстэтычныя і інш.), складваліся паступова. У імкненні да падобнага збіральніцтва і праяўляўся музейны прынцып, які не залежаў ад факта існавання спецыяльна прызначаных да гэтага ўстаноў. Вылучэнне пэўных прадметаў з мноства ім падобных ператварала іх у артэфакты пэўнага ўзроўню культуры, а затым – музейныя прадметы і калекцыі. Яны належалі асобным грамадскім супольнасцям, аўтарытэтным і багатым асобам. Да агляду грамадскіх калекцый дапускаліся простыя гледачы, у той час як да агляду прыватных збораў запрашалася вельмі абмежаваная колькасць наведвальнікаў [1, с. 12].

Аб эвалюцыі працэсу протамузеефікацыі сведчыць імкненне грамадства не толькі да захавання артэфактаў гісторыі і культуры, але і нерухомых помнікаў, якое рэалізуецца шляхам размяшчэння ў ім музея. Класічным прыкладам протамузейнай формы, якая з'явілася задоўга да ўзнікнення гэтага паняцця, з'ўляюцца культавыя збудаванні, якія часткова выконвалі музейныя функцыі. Найбольш вядомым прадстаўніком протамузейных устаноў старажытнасці можна лічыць Александрыйскі мусеён, які бесперапынна функцыянаваў не менш за 800 гадоў. У перыяд элінізму гэта быў буйнейшы цэнтр рэлігійнага, даследчага, вучэбнага і культурнага жыцця. Мусеён быў заснаваны ў пач. ІІІ ст. да



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

н. э. Пталямеем Сатэрам і знаходзіўся на дзяржаўным забеспячэнні. У склад азначанай протамузейнай установы ўваходзіла шырока вядомая Александрыйская бібліятэка, арганізаваная ў гэты ж перыяд. Вучоныя таго часу, якія належалі да мусеёна, на аснове яго калекцый займаліся філасофіяй, матэматыкай, астраноміяй, геаграфіяй, медыцынай, лінгвістыкай і інш. навукамі.

Яшчэ адным прыкладам протамузеефікацыі можа служыць Пінакатэка (сховішча карцін) на афінскім Акропалі. Некаторыя даследчыкі не лічаць гэты прыклад пачаткам музеефікацыі, так як адсутнічаюць аб'екты калекцыяніравання, якія адносіліся б да культурна-гістарычнай каштоўнасці [3, с. 113]. Нягледзячы на тое, што мы не можам дакладна сказаць, як адносілася грамадства да дадзеных аб'ектаў у старажытнасці, аднак сам факт размяшчэння Пінакатэкі на Акропалі, дзе знаходзіліся таксама і культавыя ўстановы, гаворыць аб тым, што грамадская супольнасць не размяшчала б там сховішча карцін, калі б Акропаль і помнікі мастацтва не ўяўлялі для яе гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Эвалюцыя протамузейных устаноў заняла не адно стагоддзе. Да ўзнікнення сучасных музеяў дзейнасць па захаванні важнай для пэўнай культуры ці рэгіёна інфармацыі насіла лакальны характар і ў кожнай сферы культурнага і грамадскага жыцця выпрацоўваліся свае метады падтрымання культурнай памяці. Скарбніцы, культурныя сады, храмы, аптэкі, аптэкарскія агароды, арсеналы, звярынцы ўзнікалі ў розны час і з рознымі задачамі, аднак яны валодалі, як мінімум, адной агульнай рысай: іх дзейнасць прадугледжвала назапашванне вынікаў гэтай дзейнасці або прадметаў, неабходных для яе ажыццяўлення, што азначала фарміраванне першапачатковых протамузейных фондасховішчаў. Пры аптэках з часам сфарміраваліся анатамічныя і іншыя прыродазнаўчыя калекцыі, на аснове арсеналаў былі створаны ваенна-гістарычныя музеі. Што ж датычыць культурных садоў і аптэкарскіх агародаў, яны сталі папярэднікамі музеяў жывой прыроды. На аснове скарбніц узнікалі палацавыя музеі і нацыянальныя архівы [7, с. 74–76].

Першым агульнапрызнаным фактам музеефікацыі нерухомых гісторыка-культурных помнікаў у Еўропе з'яўляюцца, на думку даследчыкаў, закансерваваныя і пакінутыя адкрытымі для паказу раскопкі гарадоў Геркуланум (з 1711 г.) і Пампеі (з 1748 г.) [2, с. 41]. Пазней фарміруюцца так званыя рысы музейнасці ў дваранскіх сядзібах: мемарыяльныя пакоі і кабінеты, рэпрэзентатыўныя палацава-паркавыя комплексы, разлічаныя на паказ шматлікім гасцям. З канца XIX ст. у межах Расійскай Імперыі з'яўляюцца першыя мемарыяльныя музеі ў дамах і сядзібах, якія належалі выдатным дзеячам культуры, напрыклад сядзіба Л. М. Талстога Ясная Паляна, флігель М. А. Някрасава ў вёсцы Карабіха і многія інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Найбольш шырока пытанні музеефікацыі распрацоўваліся ў СССР. Першыя паслярэвалюцыйныя гады і звязаныя з імі сацыяльныя пераўтварэнні абумовілі інтарэс савецкага грамадства да спроб «перавесці ў музейны стан» цэлыя пласты культуры, якая пачала знікаць. Велізарную колькасць помнікаў, у асноўным архітэктуры і садова-паркавага мастацтва, сталі абʼяўляць музеямі: музеефікацыя станавілася нярэдка адзіным шляхам захавання гісторыка-культурнай спадчыны. Сядзібы, палацы, дамы станавіліся музеямі практычна без змен (так званы фіксуючы падыход) [4, с. 41]. Яскравым прыкладам такой установы можа служыць Бібліятэка-музей А. П. Чэхава ў Таганрозе, дзе была створана экспазіцыя, прысвечаная класіку сусветнай літаратуры.

Паступова фіксуючая музеефікацыя сыходзіць у мінулае. У савецкай музейнай справе ў працэсе музеефікацыі матэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны назіраецца адыход ад прызнання галоўнай ролі за аўтэнтычнасцю абʼекта. Замест музеефікацыі помніка быў абраны метад яго прыстасавання пад антырэлігійныя, краязнаўчыя і інш. экспазіцыі. У выніку многія абʼекты музейнага значэння ў далейшым былі фізічна знішчаны [3, с. 241].

Новы этап музеефікацыі пачаўся пасля Другой сусветнай вайны, калі на хвалі патрыятызму, ва ўмовах разбурэння і страты значнай часткі нацыянальнай спадчыны адбывалася рэабілітацыя помнікаў айчыннай гісторыі. Гэты працэс знайшоў юрыдычнае афармленне ў шэрагу заканадаўчых ініцыятыў і праявіўся ў практыцы рэстаўрацыі, кансервацыі і музеефікацыі значнай колькасці гісторыка-культурных абʼектаў. Азначаны падыход да музеефікацыі характарызаваўся перавагай аналітычнай інтэрпрэтацыі абʼектаў, раскрыццём іх значэння як помнікаў гісторыі і культуры праз рэстаўрацыю «на аптымальную дату» і арганізацыю экспазіцый па гісторыі помніка і яго рэстаўрацыі. Гэты перыяд музеефікацыі вызначаны даследчыкамі як «рэстаўрацыйна-аналітычны». Сярод абʼектаў музеефікацыі на дадзеным этапе пераважалі помнікі архітэктуры і горадабудаўніцтва, археалогіі, садова-паркавага мастацтва [4, с. 42].

Наступны перыяд пачынаўся з сярэдзіны 1980-х гг., ён звязаны з сацыяльна-эканамічнымі пераўтварэннямі ў тагачасным грамадстве і кардынальнымі зменамі ўсёй музейнай сферы. На гэтым этапе імкліва пашырылася кола абʼектаў спадчыны, якія былі ўключаны ў сферу музейнага інтарэсу: зʼявіліся першыя музеі, створаныя на базе музеефікацыі прамысловых абʼектаў, разгарнулася музеефікацыя ландшафтаў, створаны першыя экамузеі. Сусветная супольнасць звярнула пільную ўвагу на праблемы захавання музеямі нематэрыяльнай спадчыны. Не засталася ў баку ад гэтага працэсу і беларуская грамадскасць.

Значнай тэндэнцыяй у развіцці сучаснага музейнага свету зʼяўляецца ўзмацненне цікавасці да ансамблевых помнікаў і музеяў навакольнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асяроддзя, якія ствараюцца на падставе музеефікаваных помнікаў – так званыя архітэктурна-ландшафтныя комплексы. Пасля распаду СССР на тэрыторыі СНД распаўсюдзіўся ўнікальны для сучаснай міжнароднай супольнасці працэс «дэмузеефікацыі», калі культавыя помнікі пачалі масава вяртаць рэлігійным установам [2, с. 392].

На сучасным этапе сацыякультурнага развіцця аб'ектамі музеефікацыі могуць быць разнастайныя віды помнікаў: помнікі гісторыі і культуры, помнікі прыроды, помнікі адзінкавыя і комплексныя, памятныя мясціны, культурна-гістарычнае асяроддзе, а таксама элементы ладу жыцця і дзейнасці людзей. Становяцца аб'ектамі музеефікацыі і «аб'екты сацыяльнай рэчаіснасці» – гэта комплексы прадметаў, якія бытуюць у наш час. Аб'ядноўвае гэтыя прадметы рэальная жыццёвая сітуацыя (як прыклад нагадаем інтэр'еры жылля, транспартныя сродкі, прамысловае абсталяванне і інш.). На падставе такіх складаных помнікаў за мяжой шырока распаўсюджана практыка арганізацыі экамузеяў, жывых музеяў і інш.

Сучасная практыка музеефікацыі нерухомых помнікаў прадугледжвае вывучэнне помніка, яго кансервацыю і рэстаўрацыю, захаванне або аднаўленне мастацка-архітэктурных або гісторыка-побытавых інтэр'ераў, а таксама прыроднага і культурна-гістарычнага асяроддзя, інтэрпрэтацыю помніка (праз музейныя экспазіцыі, выставы, тлумачальныя тэксты, мемарыяльныя дошкі), арганізацыю ўмоў для яго агляду (шляхам распрацоўкі маршрутаў агляду, вызначэння «відавых кропак» і аглядных пляцовак, усталявання маршрутных паказальнікаў і г. д.) [2, с. 390]. У выключных выпадках ствараецца навуковая рэканструкцыя страчаных помнікаў (будынкі ратуш у Магілёве, Мінску, сядзіба Т. Касцюшкі ў Мерачоўшчыне і інш.).

Усё часцей выкарыстоўваецца частковая або «мяккая» музеефікацыя, якая не дапускае поўнага выключэння аб'екта з асяроддзя бытавання і дапускае выкананне ім першапачатковых функцый [6]. Выбар форм і метадаў музеефікацыі вызначаецца тыпам помніка, яго гісторыка-культурнай каштоўнасцю і захаванасцю. Найбольшую колькасць сярод музеефікаваных помнікаў складаюць помнікі архітэктуры (замкавыя комплексы ў Міры, Нясвіжы, Лідзе і інш.).

Трэба адзначыць, што пытанне музеефікацыі помнікаў цесна звязана і з праблемай актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны. Актуалізацыя спадчыны – гэта дзейнасць, накіраваная на захаванне і ўключэнне культурнай і прыроднай спадчыны ў сучасную культуру шляхам актывізацыі сацыякультурнай ролі аб'ектаў і іх інтэрпрэтацыі [5, с. 49]. У шматлікіх выпадках у якасці пераважнага альбо адзінага магчымага сродку актуалізацыі спадчыны разглядаецца яе музеефікацыя, таму што яна прадугледжвае захаванне і трансляцыю матэрыяльных і нематэрыяльных праяў чалавечай дзейнасці будучым пакаленням.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Музеефікацыя і актуалізацыя культурнай спадчыны не існуюць без паняцця папулярызацыі, пытанне аб якой было паднята ў навуковай літаратуры адносна нядаўна. Магчыма, гэта звязана з тым, што зараз грамадства ўсё больш цікавіцца сваімі гістарычнымі каранямі. Папулярызацыя мае на ўвазе пашырэнне ведаў аб гісторыка-культурнай спадчыне ў традыцыйнай агульнадаступнай форме, а таксама шляхам яе прасоўвання ў інфармацыйнай прасторы.

У параўнанні з іншымі напрамкамі музейнай дзейнасці музеефікацыя займае асаблівае становішча. Калі ўсе астатнія кірункі музейнай дзейнасці прадстаўляюць сабой пэўныя этапы работы з рухомай матэрыяльнай спадчынай (яе выяўленне і адбор з асяроддзя бытавання, захаванне, даследаванне, прэзентацыя і інтэрпрэтацыя сродкамі музейнай экспазіцыі), то музеефікацыя нерухомай матэрыяльнай спадчыны ўключае вышэйадзначаныя этапы, але пры гэтым экспазіцыі могуць выступаць у якасці дапаўнення, ілюстрацыі да паказу інтэр'еру ці экспанавання пад адкрытым небам саміх нерухомых аб'ектаў. Пры музеефікацыі пільная ўвага надаецца арганізацыі працэсу камунікацыі з музейнай аўдыторыяй, папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны.

Эвалюцыя працэсу музеефікацыі помнікаў прайшла доўгі час развіцця, набываючы новыя рысы і значэнні ў кожнай сацыякультурнай сітуацыі. Можна вылучыць два асноўныя кірункі музеефікацыі. Першы пачынаецца са старажытных часоў і праяўляецца ў стварэнні музейнага асяроддзя шляхам калекцыяніравання рухомых прадметаў музейнага значэння, стварэння протамузейных збораў, на аснове якіх узнікаюць музеі. Другі кірунак звязаны са спробамі музеефікацыі комплексных помнікаў на месцы іх бытавання (Геркуланум, Пампеі), іх актуалізацыяй. Калі музеефікацыю рухомай гісторыка-культурнай спадчыны можна аднесці да такой галіны навуковых ведаў, як музеялогія (музеязнаўства), то музеефікацыю нерухомых аб'ектаў – да аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Такім чынам, пытанне музеефікацыі помнікаў як рухомай, так і нерухомай гісторыка-культурнай спадчыны – надзвычай актуальная з'ява і аб'ект даследавання.

1. *Грицкевич, В. П.* История музейного дела (до конца XVIII века) : автореф. дис. ... д-ра культурологии : 24.00.03 / В. П. Грицкевич ; С.-Петерб. гос. ун-т культуры и искусств. – СПб., 2002. – 34 с.

2. *Каменецкий, И. С.* Музеефикация памятников / И. С. Каменецкий, М. Е. Каулен // Российская музейная энциклопедия : в 2 т. / Рос. ин-т культурологии МК РФ и РАН ; редкол.: В. Л. Янин [и др.]. – М. : Прогресс : Рипол классик, 2001. – Т. 1. – С. 390–393.

3. *Каулен, М. Е.* Музеефикация историко-культурного наследия России / М. Е. Каулен. – М. : Этерна, 2012. – 430 с.

4. *Каулен, М. Е.* Музеефикация как одно из основных направлений музейной деятельности / М. Е. Каулен // Экологические проблемы развития музеев-заповедников: материалы X Всерос. науч. конф., Москва, 15–17 нояб. 2005 г. – М., 2008. – С. 35–50.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Каулен, М. Е.* Словарь актуальных музейных терминов / М. Е. Каулен, А. А. Сундиева, И. В. Чувилова [и др.] // Музей. – 2009. – № 5. – С. 47–68.

6. Музеефикация [Электронный ресурс] // Российская музейная энциклопедия. – Режим доступа: http://www.museum.ru/ rme/mb_musf.asp. – Дата доступа: 07.08.2016.

7. *Сундиева, А. А.* Протомузейные формы в российской культуре / А. А. Сундиева // Обсерватория культуры. – 2005. – № 3. – С. 74–77.

8. *Di Giovine, M.* The heritage-scape: UNESCO, world heritage, and tourism / M. Di Giovine. – Lanham, MD : Lexington Books, 2009. – 542 p.

*D. Gerasimenok*

**Essence of the museumification: genesis and evolution**

*The museumification as the process of conservation and optimal utilization of historical and cultural heritage, identification of scientific and artistic value of the past era objects has come a long way of development from the aspirations of society to preserve the monuments of history and culture to broad-based and targeted search, study, actualization and promotion of entire ensembles of historical, cultural and natural objects.*

*The author of the article attempted to identify the main stages of genesis and evolution of the museumification, transformation of attitudes of the scientific community on this process in the context of the world history.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 18.10.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ